Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

*УДК 947.6 "367" "17" : 338 : 338 (4)*

# Заходнееўрапейскі вопыт у спробах мадэрнізацыі эканомікі ВКЛ у другой палове XVIII ст.

І. Ф. Кітурка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У айчыннай гістарыяграфіі эканамічнае становішча ВКЛ другой паловы XVIII ст. традыцыйна характарызуецца як час ажыўлення гаспадарчага развіцця ў параўнанні з перыядам аднаўлення эканомікі пасля ваенных разбурэнняў другой паловы XVII і пачатку XVIII ст. Аднак тэрмін "мадэрнізацыя" адносна гэтага часу ў працах беларускіх гісторыкаў увогуле не ўжываецца [1, с. 109]. Упершыню другую палову XVIII ст. у беларускай гісторыі аднёс да "эпохі мадэрнізацыі" даследчык з Беластока А. Латышонак, які лічыць, што гэтая эпоха працягвалася апошнія два з паловай стагоддзі і асноўнай тэндэнцыяй гісторыі Беларусі была менавіта мадэрнізацыя грамадства.

У другой палове XVIII ст. у гаспадарчым развіцці Вялікага княства Літоўскага і ўсёй Рэчы Паспалітай сапраўды сталі праяўляцца новыя тэндэнцыі. У гэты час Рэч Паспалітая стала месцам узаемадзеяння дзвюх культур: традыцыйнай і культуры новага часу – Асветніцтва з характэрным для яго культам розуму, адукаванасці і навукі. Пад уздзеяннем ідэалогіі Асветніцтва ва ўсёй Еўропе адбывалася сапраўдная рэвізія светаўспрымання ў палітычнай, філасофскай, грамадскай і эканамічнай галінах. Сярод прыярытэтаў Асветніцтва важнае месца займала рацыянальная эканоміка, заснаваная на ідэі эканамічнага прагрэсу.

Як сведчыць гістарычны вопыт, рашаючы ўплыў на правядзенне рэформ у грамадстве аказваюць інтэлектуальныя змены, якія адбываюцца, у першую чаргу, у сферы ідэалогіі. Разуменне неабходнасці новаўвядзенняў, правядзення рэформаў, сфармуляваныя філасофіяй, заўсёды стымулююць перамены ў эканоміцы і палітыцы. Так, у другой палове XVIII ст. найбольш прагрэсіўная частка палітычнай эліты Рэчы Паспалітай бачыла аслабленне цэнтральнай улады, паглыбленне анархіі і поўную адсталасць эканомікі дзяржавы і разумела неабходнасць рэфармавання, у тым ліку і эканамічнага.

Даследаванне асноўных тэндэнцый гаспадарчага развіцця ВКЛ у другой палове XVIII ст. выразна сведчыць, што гэты час характарызаваўся не простым ажыўленнем эканомікі, як гэта прынята лічыць у беларускай гістарыяграфіі, а значнымі зменамі ў арганізацыі эканамічнага жыцця і нават у яго разуменні. На тэрыторыі ВКЛ гаспадарчыя пераўтварэнні насілі інавацыйны характар як для развіцця прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі, грунтаваліся на гаспадарчым досведзе еўрапейскіх дзяржаў і па сутнасці з'яўляліся першай спробай сапраўднай мадэрнізацыі краіны.

Значэнне тэрміна "мадэрнізацыя" было распрацавана ў першую чаргу ў такіх навуках, як сацыялогія і культурная антрапалогія, дзе мадэрнізацыя набыла форму тэорыі. Гэтая тэорыя стала метадалагічнай падставай даследавання тых грамадстваў, якія знаходзяцца ў стадыі трансфармацыі, змяняюцца і прыстасоўваюцца да новых умоваў жыцця [2, с. 5]. У падручніках па сацыялогіі адзначаецца, што паняцце мадэрнізацыі, як правіла, выкарыстоўваецца ў двух сэнсах: па-першае, для абазначэння працэсу пераўтварэння традыцыйнага грамадства ў грамадства індустрыяльнае; па-другое, як паказальнік на памкненні слабаразвітых краін дагнаць больш развітыя дзяржавы [3, с. 399].

Мадэрнізацыя ў класічнай еўрапейскай мадэлі развіцця разумеецца як інавацыйны працэс на аснове традыцыі – устойлівай асновы развіцця грамадства. Мадэрнізацыя не адмяняе традыцыю, а паступова рэфармуе яе. Традыцыя, у сваю чаргу, не блакіруе мадэрнізацыю, а абмяжоўвае яе, прыстасоўвае да існуючых рэчаў і паступова прыстасоўваецца сама.

Адносна гістарычнай навукі тэарэтычныя аспекты терміна "мадэрнізацыя" фактычна

не распрацаваны. Азначэнне згаданага тэрміна прыводзіцца толькі ў эканамічных слоўніках: "Модернизация [фр. *modernizer* от *moderne* – современный] — ввод усовершенствований, отвечающих современным требованиям" [4, с. 486]. Такое агульнае азначэнне паняцця "мадэрнізацыя" па сутнасці робіць яго універсальным – гісторыкі карыстаюцца ім для акрэслення новаўвядзенняў у разнастайных галінах грамадства ў розныя перыяды.

Так, напрыклад, вядомы расійскі даследчык Барыс Флора ўжывае гэты тэрмін нават у адносінах да развіцця Рускай дзяржавы другой паловы XV – першай паловы XVI ст. Аўтар адзначае, што "модернизация на этом этапе развития России ограничивалась заимствованием, главным образом, технической стороны тех или иных нововведений, а само удовлетворение потребностей осуществлялось путём создания новых разновидностей традиционных общественных институтов, что позволяло, в частности, достигать значительных конкретных результатов при ограниченности имевшихся в стране ресурсов" [5, с. 72].

У адпаведнасці з традыцыяй еўрапейскай гістарычнай навукі ў дадзеным артыкуле пад тэрмінам "мадэрнізацыя" разумеецца рацэс пераўтварэння даппрамысловага грамадства ў прамысловае, дзе першы перыяд вызначаецца як развіццё аграрных адносін з элементамі гандлёвага капіталізму [6].

На нашу думку, з агульным значэннем мадэрнізацыі звязана ўспрыняцце інтэлектуальнымі і палітычнымі элітамі Рэчы Паспалітай ідэалогіі Асветніцтва. Ідэі гуманізму, натуральных правоў, дасягненні ў гуманітарных і прыродазнаўчых навуках прывялі да сапраўднай рэвізіі светаўспрымання і ўсведамлення неабходнасці змены існуючай палітычнай і эканамічнай рэчаіснасці. Адбылася своеасаблівая "мадэрнізацыя ў розумах", для якой важнае значэнне меў асветніцкі спосаб разумення прагрэсу як аддзялення (ці супрацьпастаўлення) сучаснасці і мінулага [2, с. 7].

Важную ролю ў прапагандзе новых ідэй і рэалізацыі іх у жыццё адыгрална распаўсюджванне на тэрыторыі Рэчы Пасапалітай разнастайных выданняў эканамічнага характару. Змешчаныя на старонках эканамічных выданняў факты аб дасягненнях у еўрапейскіх краінах уплывалі на свядомасць людзей, на ўздым патрыятычных пачуццяў. Прыклады эканамічнага росту Англіі і Францыі і абгрунтаванне прычын, па якіх гэта адбывалася, разам з супрацьпастаўленнем былой велічы Рэчы Паспалітай рэальна існуючаму становішчу, прыводзілі да ўсведамлення неабходнасці рэфармавання гаспадарчай сістэмы Рэчы Паспалітай, абапіраючыся на гістарычныя веды, еўрапейскі вопыт і рэаліі гаспадарчага і грамадскага жыцця [7, с. 12].

У 1758 г. пабачыла свет перыядычнае выданне "Новыя эканамічныя і навуковыя веды, альбо Часопіс усіх навук, неабходных для шчаслівага жыцця людзей" [8]. Пад шчаслівым жыццём людзей у часопісе разумелася становішча, калі чалавек быў здаровы, багаты і разумны, таму артыкулы ў гэтым выданні былі "з навукі лекарскай", "навукі эканамічнай", а таксама з філасофіі і фізікі. Неабходнасць выдання такога часопіса так тлумачылася ў прадмове да першага нумару: "Трэба мець дакладную інфармацыю пра вынаходніцтвы і ўдасканаленні спосабаў жыцця розных народаў, уважліва прыглядацца да іх і выкарыстоўваць". Сугучнымі былі і палажэнні ў іншых выданнях, дзе сцвярджалася, што "эканамічных ведаў, якія грунтуюцца толькі на ўласным досведзе, мала, недастаткова, каб адкрыць вочы гаспадарам і адцягнуць іх ад уласных прызвычайнасцяў" [9, с. 24].

Фактычна ва ўсіх эканамічных выданнях асабліва падкрэслівалася, што пераймаць добры вопыт іншых краінаў – гэта зусім *не сорамна*, а, наадварот, разумна і карысна, паколькі "сапраўднае гаспадарства грунтуецца не толькі на працы рук, але і на працы галавы" [10, с. 3], таму ўсе краіны Еўропы выкарыстоўваюць лепшыя вынаходніцтвы сваіх суседзяў [11, с. 79].

Такім чынам, адной з галоўных ідэй, якая ўздымалася і прапагандавалася на старонках эканамічнай літаратуры, была ідэя неабходнасці рэфармавання гаспадарчай сістэмы Рэчы Паспалітай з улікам еўрапейскага вопыту. Верагодна, упершыню галоснай крытыцы ў другой палове XVIII ст. стала падвяргацца традыцыя, якая да гэтага часу была бясспрэчным аўтарытэтам у грамадстве, і з уласцівым для тых часоў аптымізмам пачала даказвацца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

магчымасць рацыянальнага ўплыву на правядзенне рэфармавання і змяненне будучыні. У адным з найбольш вядомых і значных перыядычных выданняў Рэчы Паспалітай, часопісе "Дзённік гістарычна-палітычны", які выходзіў з 1782 г. (з 1786 г. меў назву "Дзённік гістарычна-палітычна-эканамічны"), прама падкрэслівалася, што "ўсе правы, уставы і распараджэнні Рэчы Паспалітай можна змяніць, адмяніць і паправіць для большай выгоды ўсяго грамадства. Бо Законы існуюць для Народаў, а не Народы для Законаў. Таму яны [законы] павінны вакарыстоўвацца да таго часу, пакуль будуць карысныя для краіны" [12, с. 79].

Эканамічная літаратура прызначалася для тых, хто не хацеў заставацца "нявольнікам звычаю", а меў "здольнасці і патрэбы ў гаспадарчых ведах", каб "паправіць памылкі першапачатковага досведу" [13, с. 703]. Кнігі гаспадарчага зместу, перакладзеныя з англійскай, нямецкай, французскай моў, выдаваліся ў другой палове XVIII ст. у друкарнях як на тэрыторыі Кароны, так і ў Вялікім Княстве, у тым ліку ў Вільні, Гародні, Нясвіжы, Берасці. Колькасць эканамічных выданняў у Рэчы Паспалітай павялічылася да 130 экзэмпляраў у параўнанні з канцом XVII ст., калі іх было толькі 25 [14, с. 28].

У эканамічных выданнях знайшлі сваё адлюстраванне розныя гаспадарчыя праблемы, сярод якіх неабходнасць стварэння мануфактур, развіццё знешняга і асабліва ўнутранага гандлю, зберажэнне лесу і інш. На старонках гаспадарчай літаратуры вялася актыўная прапаганда так званага "новага земляробства". Гэтая сістэма гаспадарання ўпершыню з'явілася ў Галандыі і Англіі ў XVII ст., а ў пачатку XVIII ст. распаўсюдзілася на тэрыторыі амаль усёй Заходняй Еўропы. Галоўным прынцыпам новага земляробства з'яўлялася ліквідацыя сістэмы параў і пераход замест гэтага да лепшага ўзворвання і ўгнойвання глебы: "Добрае гаспадарства базуецца на добрай апрацоўцы зямлі, глыбокім узворванні, пастаянным засяванні, замене аднаго гатунку збожжа іншым, на ўгнойванні грунтаў" [11, с. 48]. Найбольш крытыкавалася распаўсюджаная ў той час у Рэчы Паспалітай сістэма трохполля, даказвалася яе эканамічная неэфектыўнасць. У прыватнасці, адзначалася, што "звычай пакідання 1/3 часткі поля пад так званы "пар" паходзіць з даўніх часоў, калі людзей было мала і жывёлы мала, таму не было магчымасці поле добра ўгнаіць і апрацаваць. У выніку трэцяя частка пакідалася, каб дзве другія можна было добра абрабіць, а на трэцяй каб пасвілася жывёла". Але жывёла не магла пракарміцца на паравым полі, паколькі расліннасць там слабая, а ў выніку фактычна губляўся магчымы ўраджай. "Не пару патрабуе зямля, а апрацоўкі і ўгнойвання", – рабілася выснова ў эканамічных выданнях.

Для таго, каб паправіць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы, прапаноўвалася ўвядзенне так званай "норфалкскай сістэмы", пры якой поле падзялялся на чатыры часткі і па чарзе засявалася наступным чынам: *азімыя – прапашныя культуры* (рэпа, бручка, буракі, бульба і інш.) – *яравое збожжа – канюшына*. Такая сістэма шматпольнага севазвароту патрабавала яшчэ і добрага арганічнага ўгнаення, якое, прынамсі, трэба было ўжываць з розумам, бо "нядобры перагной не тое што не паляпшае глебу, але толькі плодзіць рабакоў і прыносіць хваробы зерню" [15, с. 72].

Зразумела, што ўвядзенне новай сістэмы земляробства патрабавала значных выдаткаў і наўпрост залежала ад жадання шляхты ўкладваць у гаспадарку дадатковыя сродкі. Таму праз эканамічныя выданні рабілася спроба паўплываць на шляхту і заахвоціць яе да вядзення гаспадарання па-новаму: "Паны нашыя, якія на загранічную мэблю, гэта значыць, папросту на цацкі, трацяць тысячы чырвоных злотых, вялікую паслугу аказалі б дзяржаве, калі б прывозілі насенне і жывёлу і пераймалі суседскі вопыт гаспадарання". Разам з тым падкрэслівалася, што затраты на тое, каб прывезці добрае насенне з-за мяжы, "заўсёды будуць перакрытыя і ўзнагароджаныя добрым жнівом" [15, с. 196].

"Новае гаспадаранне" было заснавана не толькі на ўдасканаленні апрацоўкі глебы і прымяненні тэхнікі, але і на прадстаўленні сялянам эканамічнай свабоды. Філасофія Асветніцтва ўвогуле змяніла погляд на працу і на працу ў сельскай гаспадарцы ў прыватнасці. Адбывалася ўсведамленне таго, што праца з'яўляецца не ганебным заняткам, а крыніцай багацця, таму неабходна было перагледзець сістэму яе арганізацыі, каб чалавек працаваў не па прымусу, а з ахвотай і жаданнем [16, с. 33–34]. Такія па сутнасці

РЭПОЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКОРЫНЫ

рэвалюцыйныя змены ў адносінах да фізічнай працы вялі да разумення неабходнасці і сацыяльных пераменаў у грамадстве, галоўным з якіх было наданне свабоды сялянам. Бо "цяжар вялікай, часам невыносна цяжкай працы так ганьбіць цела і розум беднага земляроба, што ён працуе без задавальнення, без ахвоты, поўны роспачы, апускаецца ва ўсім і ледзь памятае, што створаны вольным чалавекам і гэтым адрозніваецца ад працуючай побач жывёлы" [8, с. 163], а "ўдасканаленне заняцця земляробствам – справа людзей вольных, адукаваных, разумных, вынаходлівых, якія клапоцяцца аб сваёй маёмасці... і адчуваюць абароненасць у сваіх дамах". Больш за тое, у 1786 г. у "Дзённіку гістарычна-палітычна-эканамічным" сцвярджалася, што "культура Еўропы пачалася ў той час, калі людзі працоўнага класу былі вызвалены з кайданоў няволі, у якія іх закавала феадальная Канстытуцыя той часткі свету" [12, с. 183].

Ідэя надання сялянам эканамічнай свабоды ўваходзіла ў супярэчнасць з існуючай у той час фальваркава-паншчыннай сістэмай, заснаванай на працы сялян. Для вырашэння гэтага пытання прапаноўваліся два асноўныя варыянты: альбо ліквідацыя фальваркаў і перадача зямлі сялянам на ўмовах выплаты чыншу[3], альбо выкарыстанне наёмных работнікаў, паколькі, як адзначалася ў эканамічнай літаратуры, у параўнанні з паншчыннай працай "наёмныя людзі больш прыбытку для фальварку прынясуць" [17, с. 556]. У любым выпадку, ачыншаванне сялян, якое б садзейнічала росту таварнасці сялянскай гаспадаркі, з'яўлялася неад'емнай часткай новай сістэмы земляробства і яго мэтазгоднасць не ставілася пад сумненне, тым больш, што яно прайшло перыяд апрабацыі ў дзяржаўных уладаннях ВКЛ у другой палове XVII і першай палове XVIII ст. Але пры гэтым некаторыя аўтары слушна заўважалі, што паляпшэнню становішча падданых і ўдасканаленню сельскай гаспадаркі дапаможа "не замена слова "паншчына" на слова "чынш", а сапраўдная змена павіннасцяў" [18]. Такім чынам, у літаратуры наўпрост вызначалася сувязь і залежнасць паміж поспехам у рэфармаванні сельскай гаспадаркі і абавязковасцю сацыяльных пераўтварэнняў у грамадстве.

Паказальна, што ў якасці ініцыятараў, фундатараў, а часам і аўтараў перакладаў эканамічных выданняў выступалі вядомыя ў ВКЛ асобы, напрыклад, віленскі біскуп Ігнацій Якуб Масальскі, ксёндз і матэматык Рыгор Князевіч, знакаміты рэфарматар ксёндз Павел Бжастоўскі і інш. Неабходна падкрэсліць, што ў большасці сваёй гэтыя людзі не толькі прапагандавалі новыя спосабы вядзення гаспадаркі, але і выкарыстоўвалі іх ва ўласных маёнтках.

Так, напрыклад, біскуп І. Масальскі, разумеючы, што адной з галоўных перашкод на шляху развіцця гаспадаркі былі недасканалыя прылады працы, купляў у Англіі розныя прылады і прыстасаванні для працы на зямлі, якія можна было прымяніць і пры апрацоўцы глебы ў ВКЛ, для таго, каб яны "былі ўзорам для вырабу такіх прыладаў у краіне" [15, с. 17]. Акрамя таго, ён нават абвясціў конкурс і абяцаў узнагароду таму, хто прапануе "найлепшы спосаб гаспадарчай адукацыі сялян", якія з'яўляліся асноўнай вытворчай сілай у грамадстве і ад працы якіх у многім залежаў стан сельскай гаспадаркі.

Асветніцка-прапагадысцкая дзейнасць І. Масальскага знайшла практычнае прымяненне ў шэрагу яго ўладанняў. Так, напрыклад, ва ўставе інвентара маёнтка Убарць альбо Лельчыцы Мазырскага павету за 1780 г., які належаў І. Масальскаму як Віленскаму біскупу, было зафіксавана, што "ўласнасць кожнага жыхара забяспечана на вечныя часы такім чынам, што яны свабодныя распараджацца і прадаваць паводле свайго жадання зямлю, хаты, усялякую рухомасць, а двор ні пад якой прычынай не павінен у гэта ўмешвацца" [19]. Згодна з іншымі палажэннямі устава, сялянам таксама забяспечваліся: свабода гандлю, адукацыя сялянскіх дзяцей, абшчыннае самакіраванне, грашовая аплата за розныя віды працы на патрэбы двара і інш.

Гаспадарчай адукацыяй сваіх сялян займаўся і Павел Бжастоўскі ва ўладанні Мерач пад Вільняй, якое ў яго гонар было перайменавана ў Паўлава. Агульнавядома, што ў Паўлаве

[3] Przykład nowy bardzo łatwego a znacznego pomnożenia intraty z dobr dziedzicznych // Wybor wiadomości gospodarskich. – S. 162–173.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

была створана своеасаблівая "рэспубліка" з уласным кіраўніцтвам, правам, фінансамі, войскам, дзедзіч якой быў яе дажывотным прэзідэнтам. У 1770 г. П.Бжастоўскі выдаў у Вільні невялікую кніжку пад назвай "Пра земляробства для выгоднасці гаспадароў, якія жывуць у Паўлаве" [10]. У ёй тлумачылася, што земляробства – гэта навука і яе трэба ведаць, а менавіта, ведаць якасць сваіх грунтаў, хваробы раслінаў і жывёлы, своечасова пачынаць сельскагаспадарчыя работы і г. д.

Відавочна, што ўвядзенне новай сістэмы гаспадарання для эканомікі ўсёй Рэчы Паспалітай і ВКЛ у прыватнасці было справай не аднаго дня, а з эканамічных выданняў другой паловы XVIII ст. вынікала, што земляробства з'яўляецца не простым звычайным заняткам, а цэлай сельскагаспадарчай навукай, якой трэба вучыцца. У сувязі з гэтым вялікая роля надавалася пашырэнню асветы сярод грамадзян, у тым ліку і ў асяроддзі непасрэдных вытворцаў – сялян: "Сярод патрэбаў кожнай краіны першай з'яўляецца асвета. Адукацыйны фундуш павінен укладвацца ў розныя рэчы", у тым ліку і заснаванне школ на вёсках [12, с. 349]. На старонках эканамічных выданняў абмяркоўвалася неабходнасць заснавання сельскагаспадарчай Акадэміі, дзякуючы якой "адразу з'явіліся б таварыствы, вучоныя асобы, якія б з Акадэміяй ліставаліся. Акадэмія магла б збіраць эканамічныя лісты і выдаваць іх штотыдзень або штомесяц накшталт газеты, магла б атрымоўваць замежную карэспандэнцыю, высылаць вучоных у чужыя краіны, даваць свае парады ўраду" [15, с. 42].

Вядома, што ўзаемадзеянне насельніцтва, рэсурсаў і тэхналогіі ў эканоміцы вызначаецца сацыяльнымі інстытутамі, якія ўключаюць у сябе таксама каштоўнасці і погляды людзей. Гэты комплекс пераменных называюць "сацыякультурным кантэкстам" або "інстытуцыянальнай матрыцай" эканамічнай дзейнасці [20, с. 22]. Адна з асноўных функцый гэтых сацыяльных і дзяржаўных інстытутаў заключаецца ў тым, каб забяспечыць элементы пераемнасці і стабільнасці, без якіх грамадству пагражае дэзынтэграцыя. Адметнай з'явай у гісторыі Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII ст. было актыўнае ўключэнне дзяржаўных інстытутаў у эканамічнае жыццё – дзяржаўная ўлада пачала выступаць як прапагандыст гаспадарчых рэформаў.

Так, рашэннем канвакацыйнага сойму 1764 г. для ВКЛ была створана Эканамічная Рада Літоўскага скарбу – спецыяльны дзяржаўны орган, які адказваў за эканамічнае развіццё краіны. У яго кампетэнцыю ўваходзіў разгляд усіх магчымых прапаноў па паляпшэнню спосабаў вядзення гаспадаркі і павелічэнню прыбыткаў.

Фарміраванню новых эканамічных адносін садзейнічаў шэраг гаспадарчых законаў, сярод якіх можна адзначыць абмежаванне права вета па эканамічных пытаннях, дазвол мяшчанам набываць феадальныя маёнткі, а шляхце займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю і гандлем без страты сваіх шляхецкіх правоў [21, с. 109]. Станоўчы ўплыў на развіццё ўнутранага і знешняга гандлю ў другой палове XVIII ст. аказала будаўніцтва трактаў і водных каналаў.

Дзяржаўная ўлада выступала ў той час і як ініцыятар стварэння мануфактур, у тым ліку і ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ. У згаданым ужо часопісе "Новыя эканамічныя і навуковыя веды" ў 1758 г. гаварылася, што заснаванне такіх прадпрыемстваў вельмі неабходнае, бо "калі паглядзець на польскую даму або кавалера, то можна ўбачыць, што яны з ног да галавы апранутыя ва ўсё заграмічнае. А гэта ёсць вялікае няшчасце!" [22, с. 86]. Аўтары часопіса падкрэслівалі, што не адзін з галоўных поспехаў гаспадарчага развіцця грунтуецца на вызначэнні ўсяго таго, што можна стварыць і мець у сваёй дзяржаве, каб з іншых краін не ўвозіць.

Разам з тым, аўтарамі часопіса разумелася, што мануфактуры, якія з'явяцца на землях Рэчы Паспалітай, не адразу будуць дасканалымі. "Нашыя суседзі – немцы, англічане, галандцы, французы, італьянцы нас у гэтым даўно апярэдзілі як з пункту гледжання сваёй працы, так і гандлю паміж сабой. Цяжка нам з імі параўнацца, але гэта і не патрэбна. Дастаткова для нас будзе, калі шляхам арганізацыі мануфактур зменшым колькасць замежных тавараў і грошы будуць заставацца ў краіне" [22, с. 86].

Мануфактуры, якія былі закладзены ў эканоміях ВКЛ падчас адміністрацыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А. Тызенгаўза, павінны былі забяспечыць прамысловымі таварамі ў першую чаргу ўнутраны рынак. Праўда, яны былі заснаваны на фактычна дарэмнай працы каралеўскіх сялян. Але, магчыма, гэта была своеасаблівая палітыка дзяржаўнага пратэкцыянізму для прамысловасці, паколькі такая палітыка выражаецца не толькі ў падтрымцы самой ідэі тэхнічнага прагрэсу, наданні розных прывілеяў і льгот, але, у першую чаргу, у дзеяннях, якія забяспечвалі канкурэнтаздольнасць тавараў, што выпускаліся ў краіне. На этапе станаўлення прамысловасці гэта магло быць дасягнута ў тым ліку і за кошт выкарыстання таннай рабочай сілы.

Такая з'ява не была вынаходніцтвам Рэчы Паспалітай. У Прусіі і Аўстрыі з гэтай мэтай у якасці рабочых на фабрыкі пасылалі жаўнераў і нават выкарыстоўвалі працу дзяцей [23, с. 84]. Палітыка дзяржаўнага пратэкцыянізму для станаўлення ўласнай прамысловасці актыўна ўжывалася ў Англіі, Францыі, ЗША.

Такім чынам, гаспадарчае жыццё ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. адчувала пэўны ўплыў ідэй еўрапейскага Асветніцтва. Мадэрнізацыя сельскай гаспадаркі на пачатковым этапе была звязана, у першую чаргу, з увядзеннем новых спосабаў апрацоўкі глебы, паўторнымі ўзворваннямі, адменай сістэмы "параў", павелічэннем ролі жывёлагадоўлі. Гэта не пярэчыла такім самым працэсам у Заходняй Еўропе, дзе першапачатковая мадэрнізацыя ў сельскай гаспадарцы таксама звязваецца не з ужываннем тэхнікі, а з удасканаленнем земляробства і ўвядзеннем "новага гаспадарання". Яшчэ да сярэдзіны XIX ст. машынная тэхніка ў Еўропе адыгрывала нязначную ролю: сеялка, якая была зроблена ў 1733 г., выкарыстоўвалася ў сярэдзіне XVIII ст. толькі ва Усходнім Норфалку, у іншых месцах – з пачатку XIX ст.; трохкутны плуг (1731 г.), які дазваляў узворванне на двух конях адным чалавекам, не выкарыстоўваўся да 1870-х г.; да 1830 г. звычайнымі прыладамі працы на англійскіх фермах былі цэп, серп і каса [24, с. 576–577].

Аднак, падсумоваючы вышэйсказанае, неабходна заўважыць, што ў шырокім сэнсе ўплыў на сельскую гаспадарку ВКЛ дыскусія аб неабходнасці рэфармавання эканомікі краіны аказала ўсё ж невялікі. Прапанаваныя новаўвядзенні заставаліся пераважна на паперы.

Чаму? Можна паспрабаваць знайсці некаторыя тлумачэнні:

па-першае, увядзенне новай сістэмы гаспадарання патрабавала першапачаткова укладвання значных сродкаў, якія маглі акупіцца толькі праз некаторы час. Шляхта ВКЛ, напэўна, не была гатова да шырокага інвеставання сродкаў у сельскую гаспадарку, якое было звязана яшчэ і з пэўнай рызыкай, паколькі папярэднія сярэдзіне XVIII ст. сто гадоў з'яўляліся часам не развіцця, а двухразовай адбудовы гаспадаркі пасля шэрагу разбуральных войн (казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг., вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг. і Паўночнай вайны 1700–1721 гг.). Такім чынам, пэўная стабілізацыя сельскай гаспадаркі да сярэдзіны XVIII ст. спакушала шляхту на пошук спосабаў хуткага атрымання даходу, пераважна за кошт павелічэння падаткава-павіннаснага ціску падданых, а не на сумніўнае укладванне сродкаў (якіх, магчыма, і не было ў дастатковай колькасці?) дзеля будучых ураджаяў і прыбыткаў;

па-другое, нягледзячы на крытыку ў эканамічнай і грамадска-палітычнай літаратуры існуючых традыцыйных поглядаў, змяніць за кароткі тэрмін стэрэатыпы гаспадарчага мыслення большай часткі шляхты было немажліва, таму аўтарытэт традыцыі і "старыны" па-ранейшаму панаваў у дзяржаве. Грамадства выразна падзялілася на дзве часткі – прапагандыстаў і аматараў рэформ і прыхільнікаў захавання традыцыйнага ладу жыцця;

па-трэцяе, паколькі прыхільнікам рэформ выступаў сам кароль Польшчы і вялікі князь Літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, то менавіта мадэрнізацыя дзяржаўных уладанняў і увядзенне ў іх "новага земляробства" магло даць прыклад прыватным уласнікам. Так, у каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ у другой палове 60-х – 70-я г. XVIII ст. па ініцыятыве надворнага падскарбія ВКЛ Антонія Тызенгаўза была праведзена аграрная рэформа, якая суправаджалася ўвядзеннем шматполля, выкарыстаннем больш дасканалых прылад працы, высаджваннем садовых дрэў, выкарыстоўваннем лепшых парод жывёлы, стварэннем на вёсках камунальных кас і камунальных магазінаў і інш. Аднак А. Тызенгаўз хацеў спалучыць "новае земляробства" з захаваннем асноў феадальнай гаспадаркі – паншчыннай працай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сялян. Такім чынам, быў праігнараваны адзін з асноўных прынцыпаў новага спосабу вядзення гаспадаркі – эканамічная свабода сялян. Павелічэнне павіннаснага ціску выклікала масавыя ўцёкі сялян з дзяржаўных уладанняў, і, па сутнасці, рэформа правалілася, так і не стаўшы прыкладам для прыватных уласнікаў;

і па-чацвёртае, складаная палітычная сітуацыя, звязаная з першым падзелам Рэчы Паспалітай, прымушала шукаць у першую чаргу палітычныя і ваенныя шляхі ратавання краіны. І хоць літаратура другой паловы XVIII ст. вучыла, што эканамічная магутнасць – аснова палітычнай бяспекі краіны, па сутнасці, эканамічныя рэформы і ўвядзенне “новага земляробства” заставаліся справай іх прапагандыстаў.

**Abstract.** Western European experience in attempts of modernizing the economy of the Grand Duchy of Lithuania in the second half of the 18$^{th}$ century is considered in the paper. It also reveals its insignificant influence on the agriculture of the country.

### Літаратура

1. Латышонак, А. Да перыядызацыі гісторыі Беларусі ў эпоху мадэрнізацыі / А. Латышонак // Гістарычны альманах. – 2001. – Т. 4.

2. Gawlas, Sl. Polska Kazimerza Wielkiego a inne monarchie Europy Srodkowej – możliwości i granice modernizacji władzy / Sl. Gawlas // Modernizacja struktur władzy w warunkach opóznienia: Europa Srodkowa i Wschodnia na przełomie średniowiecza i czasów nowożytnych. Warszawa, 1999.

3. Филатова, О. Г. Социология : Учебник для вузов / О. Г. Филатова. – СПб, 2002.

4. Большой экономический словарь / Под ред. А. Н. Азрилияна. М., 1999.

5. Флоря, Б. Централизация и модернизация Русского государства во второй половине XV – первой половине XVI в. / Б. Флоря // Modernizacja struktur władzy w warunkach opóznienia.

6. От аграрного общества к государству всеобщего благосостояния: Модернизация Западной Европы с XV в. до 1980-х гг. – М. : РОССПЭН, 1998. – 432 с.

7 Z dziejów polskiej myśli filozoficznej i społecznej. – T. II: Wiek XVIII: Oświecenie. – Warszawa, 1956. – S. 12.

8. Nowe wiadomości ekonomiczne i uczone albo Magazyn wszystkich nauk do szczęśliwego życia ludzkiego potrzebnych. Wydane przez Wawrzynca Mitzlera de Kolof Filozofii i Medycyny Doktora, Historii Rzeczypospolitej Pisarza, różnych Akademii cudzozemskich Towarzysza J.K.M.K. – T. 1. – Warszawa, 1758. – 743 s.

9. Wybor ekonomicznych wiadomości z ciąg najprzedniejszych zagranicznych. – Warszawa, 1770.

10. O rolnictwie dla wygody gospodarzów w Pawłowie mieszkających. – Wilno, 1770.

11. Folwark w którym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. Przełożony na polski język przez X. Grzegorza Kniażewicza Matem. JW. JX. Biskupa Wilen. W Wilnie w Drukarni J. K. M. Rzpltej Akademickiej Societatis Jesu, 1770. – Przedmowa.

12. Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny. – T. I. – Warszawa, 1789.

13. Dzieło o rolnictwie. Przez P.Duhamel du Monceau, Towarzysza wielu Akademii y Towarzyszów Rolniczych Najwyższego we Francyi Sędziego Portowego. Po francuzku napisane. Na polski język przetłómaczone. T.1. Wilno, 1770. S. 703.

14. Zarys polskiej myśli ekonomiczno-rolniczej do drugiej wojny światowej /pod. red. A. Żabko-Potopowicza. – Wrocław – Warszawa – Kraków – Gdańsk, 1973.

15. Kalendarz Rolniczy i Gospodarski przez P. Bradley napisany przez X. Grzegorza Kniażewicza na polski język przełożony. – Wilno, 1770.

16. Historia kultury materialnej Polski w zarysie /Pod red. Zofii Kamieńskiej i Bohdana Baranowskiego. – T. IV: Od połowy XVII do końca XVIII wieku. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1978.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

17. Biblioteka Narodowa w Warszawie. Archiwum Czartoryskich, m/f 164.

18. Zasady o rolnictwie, Rękodziełach i Handlu. Poprzedzaiące Proiekta Ekonomiczne Stosowane do Konstytucyi Kommissyi Cywilno–Woyskowey. Pożyteczne dla Osob Kommissyinych iako i dla innych Właścicielów Dóbr. – Suprasl, 1790. – № 15.

19. Рукапісны аддзел бібліятэкі Віленскага універсітэта. – F. 57 – Б. 53 – 137. – Арк. 25 адв.

20. Камерон. Р. Краткая экономическая история мира от палеолита до наших дней / Р. Камерон. – М., 2001.

21. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн. : "Экаперспектыва", 1996.

22. O sposobach ustanowienia handlów w Polsce, i przeprowadzenia ich do doskonałości // Wybor wiadomości gospodarskich. – T. 1.

23. Baszkiewicz, J. Władza / J. Baszkiewicz // Pod red. nauk. A.Mączaka. Wrocław–Warszawa–Kraków, 1999. S. 84.

24. Бродель, Ф. Время мира: Материальная цивилизация, экономика и капитализм. XV–XVIII вв. / Ф. Бродель. – Т. 3.

Гродненский государственный
университет им. Я. Купалы

Поступило 16.12.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ